УДК [947.6-15+338.43.02(476-15=38)(091)]«1941/1944»

С.Л. Казлова, аспірантка ІГ НАН Беларусі

# СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫЯ ШКОЛЫ І АГРАНАМІЧНЫЯ КУРСЫ ЯК СРОДАК НЯМЕЦКАЙ АГРАРНАЙ ПАЛІТЫКІ Ў ЗАХОДНІХ РАЁНАХ ГЕНЕРАЛЬНАЙ АКРУГІ БЕЛАРУСЬ (1941–1944)

The article includes the analyses of Germans agrarian schools in Belarus during World War II, as well as its influence on propaganda system.

Закранаючы тэму Вялікай Айчыннай вайны, беларускія гісторыкі ў асноўным займаюцца пытаннямі ваенных дзеянняў, партызанскім і падпольным рухам. Тэма жыцця людзей на акупаванай тэрыторыі Беларусі застаецца мала распрацаванай. Між тым, яе вывучэнне выклікае вялікую навуковую цікавасць. У артыкуле будзе зроблена спроба асвятліць дзейнасць сельскагаспадарчых школ і агранамічных курсаў на тэрыторыі заходніх раёнаў Генеральнай акругі Беларусь па матэрыялах Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь. Дзейнасць дадзеных устаноў была часткай сістэмы эканамічнай палітыкі немцаў на тэрыторыі Беларусі. У лютым 1941 года быў створаны штаб «Ольдэнбург», які павінен быў распрацаваць эканамічныя планы на перыяд ваенных дзеянняў. Галоўнай ідэяй гэтых планаў было забеспячэнне вермахту і Германіі мясцовай сельскагаспадарчай прадукцыяй. У генеральным плане «Ост» была закладзена таксама ідэя высялення 7 мільёнаў беларусаў і засялення гэтай тэрыторыі нямецкімі каланістамі, 3 мільёны беларусаў планавалася заставіць у якасці дапаможнай працоўнай сілы. Згодна з дадзенай устаноўкай, трэба было падрыхтоўваць мясцовых спецыялістаў для сельскай гаспадаркі [1, с. 12–15; 130–131].

Увосень 1941 года выйшла распараджэнне генеральнага камісара Кубэ, згодна з ім трэба было даць магчымасць давучыцца беларускім студэнтам агранамічных факультэтаў, вучоба якіх была спынена ваеннымі дзеяннямі. Такім чынам планавалася рыхтаваць кадры для кіраўніцтва сельскагаспадарчымі школамі [2, с. 1]. У прэсе і на радыё праводзілася актыўнае прапагандаванне сельскагаспадарчай адукацыі. 15 траўня 1942 года ў газеце «Minsker Zeitung» быў апублікаваны артыкул «Узнікненне сялянскіх прафесійных школ». У ім гаварылася: «Сельскагаспадарчы аддзел генеральнага камісарыята прыкладае ўсе намаганні, каб правесці будаўніцтва сектара сельскай гаспадаркі мясцовымі сіламі. Для гэтай мэты ў кожнай мясцовасці будзе заснаваная спецыяльная школа, якая будзе рыхтаваць аграномаў і кіраўнікоў сельскагаспадарчых прадпрыемстваў па нямецкай методыцы. У хуткім часе павінна быць заснавана каля 20 такіх школ. Наступнай мэтай будзе заснаванне вышэйшай земляробчай школы, вучэбны план якой будзе складацца з 2 тэарэтычных курсаў і практычных заняткаў. Яна будзе рыхтаваць настаўнікаў...» [3, с. 23]. Былі вызначаны праграмы навучання ў сельскагаспадарчых школах, якія складаліся з 80 вучэбных гадзін, што адводзіліся на вывучэнне натуразнаўства, народазнаўства (яно ўключала ў сябе расійскую гісторыю, нямецкую гісторыю, гісторыю сельскай гаспадаркі выкладанне новага парадку землекіравання), нямецкую мову, навуку аб вядзенні сельскай гаспадаркі (вывучэнне севазвароту, жывёлагадоўлі, сельскагаспадарчай статыстыкі і бухалтэрыі, выкарыстанне сельскагаспадарчай тэхнікі) [4, с. 2–6].

У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь маецца спіс настаўнікаў сельскагаспадарчых школ Генеральнай акругі Беларусь. У ім даецца наступная інфармацыя: прозвішча, імя, месца жыхарства, дата нараджэння, а таксама месца працы і прадмет выкладання. [5, с. 95]. Штат школ павінен быў забяспечвацца фінансамі з фінансавага аддзела і аддзела сельскай гаспадаркі. Пры паступленні на працу абавязкова трэба было падаць аўтабіяграфію і копію дыплома ў нямецкім перакладзе.

Згодна з дакументальнымі матэрыяламі Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, у

1942 годзе ў заходніх раёнах Генеральнай акругі Беларусь былі адкрытыя наступныя сельскагаспадарчыя школы:

1) у вёсцы Сваятычы Баранавіцкай акругі на 40 вучняў;
2) у вёсцы Касцяневічы Вілейскай акругі на 80 вучняў;
3) у вёсцы Лучай Глыбоцкай акругі на 40 вучняў [6, с. 90–94].

15 верасня 1942 года ў газеце «Minsker Zeitung» быў апублікаваны артыкул «Сельскагаспадарчая школа ў Лучаі»: «Каб устанавіць новыя земляробчыя метады, а таксама забяспечыць правільнае карыстанне ўгнаеннямі, паміж Паставамі і Данілавічамі была заснавана сельскагаспадарчая школа (на тэрыторыі дзяржмаёнтку Лучай). За аднагадовы курс каля 50 юных сялянаў атрымаюць спецыяльную адукацыю. Побач з тэарэтычнай адукацыяй будуць таксама праводзіцца і практычныя заняткі. Гэта вельмі ўдзячная справа, бо юныя сяляне здолеюць у далейшым рэалізаваць навыкі і веды, набытыя ў школе, падчас сваёй працы. Спецыяльны інвентар у школу ўжо завезены, таксама праведзены рамонт памяшканняў. Заняткі плануецца пачаць у лістападзе гэтага года» [7, с. 24].

У 1943 годзе адбылася будоўля наступных новых сельскагаспадарчых школ:

– двухкласнай у вёсцы Плебанія Вілейскай акругі, разлічанай на 40 вучняў;
– у вёсцы Грыбава Слонімскай акругі, якая была пабудавана разам з садаводчай школай. У першы год планавалася набраць каля 40 вучняў;
– садаводчай у Баранавіцкай акрузе [8, с. 93–94].

9 жніўня 1943 года аддзел сельскай гаспадаркі атрымаў дапамогу ў спецыялізаваны пададдзел сельскагаспадарчых школ у выглядзе 12 124 падручнікаў, кабінетнай мэблі, рознага школьнага інвентару. Паступілі падручнікі па матэматыцы, фізіцы, хіміі, батаніцы, заалогіі, нямецкай мове, мікрабіялогіі, мінералогіі, геаграфіі, гісторыі, філасофіі, аграхіміі, меліярацыі, геадэзіі і г. д. Ужо адзін гэты спіс сцвярджае аб тым, наколькі сур'ёзна немцы вырашылі падысці да праблемы адукацыі сельскагаспадарчых працаўнікоў.

Нямецкія акупацыйныя ўлады лічылі, што галоўнай задачай сельскагаспадарчай адукацыі з'яўляецца перш за ўсё падрыхтоўка кадраў [9, с. 87]. Але гэту задачу было вельмі цяжка выканаць. Кіраўнік галоўнага аддзела Фрайтаг адзначаў, што, нягледзячы на арганізацыю школ, па-ранейшаму не хапае мясцовых аграномаў-тэхнікаў, кіраўнікоў сельскагаспадарчых прадпрыемстваў і іншых прафесійных сіл для аграрнага сектара. У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь захоўваецца інфармацыя толькі аб шасці сельскагаспадарчых школах. Аналіз архіўных дакументаў (справаздач, запісак, распараджэнняў) паказвае, з якімі асноўнымі праблемамі сутыкнуліся іх стваральнікі і арганізатары. Перш за ўсё гэта партызанская дзейнасць. Партызаны падпальвалі такія школы, праследавалі настаўнікаў. Другое – гэта няхватка памяшканняў, а таксама выкладчыкаў.

Для падрыхтоўкі аграномаў і паляпшэння іх адукацыйнага ўзроўню праводзіліся таксама агранамічныя курсы. Першыя такія курсы былі арганізаваныя ў сакавіку 1942 года і праходзілі ў Глыбокім, Вілейцы, Лідзе, Навагрудку, Слоніме, Баранавічах, Слуцку. Паводле матэрыялаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, вучэбны план дадзеных курсаў складаўся з агульнага землеўпарадкавання, спецыялізаванага землеўпарадкавання, чыталіся лекцыі па ўтрыманню жывёл, па кармах, па паляводству, сельскагаспадарчай тэхніцы, раслінаводству, праводзіліся дыскусіі і практычныя заняткі [10, с. 1–2].

Згодна з нямецкімі дакументамі Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, 5 сакавіка 1942 года кіраўнік пададдзела сельскагаспадарчых спецыялізаваных школ даслаў гаўляйтэру справаздачу, у якой напісаў аб пачатку правядзення сельскагаспадарчых курсаў. Са справаздачы мы даведваемся, што курсы наведвалі каля дваццаці мясцовых аграномаў, якія вывучалі розныя прадметы. Прадмет «Задачы аграрнай праграмы» выкладаў кіраўнік аддзела сельскай гаспадаркі Фрайтаг. Згодна з нямецкімі дакументамі,

аграномы вельмі добра адзываліся аб правядзенні курсаў і прасілі хутчэй правесці новыя [11, с. 19]. У жніўні 1942 года агранамічныя курсы праводзяцца зноў. Вучэбны план гэтых курсаў складаўся з заняткаў па жывёлагадоўлі, раслінаводству, паляводству, малакаводству і г. д. [12, с. 24]. На жаль, няма інфармацыі аб месцы іх правядзення і колькасці ўдзельнікаў. Таксама маюцца звесткі аб курсах, якія праводзіліся ў Глыбокім ў лістападзе 1943 года. З іх мы даведваемся, што за 1 гадзіну лекцый выкладчыкі атрымлівалі 2 маркі [13, с. 54]. Падчас правядзення агранамічных курсаў чыталіся лекцыі не толькі па сельскай гаспадарцы. Як паказвае аналіз архіўных дадзеных, падавалася шмат прапагандысцкай інфармацыі. Чыталіся таксама лекцыі па нямецкаму праву, па гісторыі нацыянал-сацыялісцкай працоўнай партыі Германіі, крытыкавалася кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 года ў Расіі і наогул уся савецкая сістэма. Немцы планавалі падрыхтаваць працоўныя кадры «ўсур'ёз і назаўжды», з поўнай ідэалагічнай апрацоўкай, разлічваючы на хуткі зыход вайны.

Такім чынам, стварэнне і дзейнасць сельскагаспадарчых школ і агранамічных курсаў ажыццяўляліся згодна з планамі немцаў аб каланізацыі беларускай тэрыторыі і падрыхтоўцы часткі насельніцтва ў якасці працоўнай сілы. У 1944 годзе іх дзейнасць прыпыняецца ў сувязі з разгарнуўшымся моцным партызанскім рухам, а таксама набліжаючымся фронтам.

## ЛІТАРАТУРА

1. Факторович А. Крах аграрной политики немецко-фашистских оккупантов в Беларуси. Мн., 1979 г., Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Мн.: Беларуская Энцыклапедыя. Т. 1.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 370, воп. 1, спр. 269.
3. НАРБ. Ф. 370, воп. 1, спр. 269.
4. Тамсама, воп. 1, спр. 842.
5. Тамсама, спр. 268.
6. Тамсама.
7. Тамсама, спр. 269.
8. Тамсама, спр. 268.
9. Тамсама.
10. Тамсама , спр. 844.
11. Тамсама, спр. 19.
12. Тамсама, спр. 844.
13. Тамсама, спр. 842.